Хвала Езусу Хрысту!
Дарагія каталіцкія вернікі, асабліва тыя з вас, хто пакутуюць з прычыны таго, што з'яўляюцца сведкамі беспрэцэдэнтнага крызісу, які перажывае наша Святая Маці-Касцёл. Дарагія каталіцкія бацькі і маці сем'яў! Дарагая каталіцкая моладзь! Дарагія нявінныя каталіцкія дзеткі! І асабліва дарагія сёстры кантэмпляцыйных супольнасцей, духоўныя пярліны Касцёла! Дарагія клерыкі! Дарагія каталіцкія святары, якія з'яўляюцца "любоўю Найсвяцейшага Сэрца Езуса"!
Заблытанасць і разгубленнасць  ўнутры Касцёла дасягнулі такой ступені, што мы павінны маліцца Богу словамі Эстэры: "няма ў нас памочніка, акрамя Цябе" (пар. Эст 4,31 LXX). Таму давайце знойдзем прытулак у Беззаганным сэрцы Марыі, выпрошваючы ў Бога ў штодзённай малітве святых Папаў Рымскіх. Давайце ўсклікнем разам з псальмапеўцам: "Паўстань, Пане, чаму Ты спіш? Паўстань, Пане, дапамажы нам і прынясі нам збаўленне!"(пар. Пс 43(44),24).
18 студзеня 2024 г., старажытнае свята Пасаду святога Пятра ў Рыме.
+ Атаназій Шнайдер, дапаможны біскуп Архідыяцэзіі Святой Марыі ў Астане

**Малітва аб выпрошванні святых Папаў Рымскіх**

Kyrie Eleison! Christe Eleison! Kyrie Eleison! Пане Езусе Хрысце, Добры Пастыр! Сваёй усемагутнай рукой ты накіроўваеш Твой Касцёл, які пілігрымуе праз буры кожнага часу.

Упрыгож Святы Пасад святымі папамі, якія не баяцца моцных гэтага свету і не ідуць на кампраміс з духам часу, але захоўваюць, ўмацоўваюць і абараняюць каталіцкую веру аж да праліцця сваёй крыві, а таксама выконваюць, абараняюць і перадаюць блаславёную літургію Рымскага Касцёла.

Пане, вярніся да нас праз святых Папаў, якія, запаленыя рэўнасцю Апосталаў, абвяшчаюць усяму свету: "Няма ні ў кім іншым збаўлення, бо няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, у якім мы можам атрымаць збаўленне" (пар. Дз 4, 10-12).

Няхай праз эпоху святых папаў Святы Пасад, які з'яўляецца айчынай для ўсіх абаронцаў каталіцкай і апостальскай веры, заўсёды ззяе як трон праўды для ўсяго свету. Пачуй нас, Пане, і праз заступніцтва Беззаганнага Сэрца Марыі, Маці Касцёла, дай нам святых Папаў, дай нам шмат святых Папаў! Змілуйся над намі і пачуй нас! Амэн.